*Л.В.ШЫБАЕВА*

# ЦЫВІЛІЗАЦЫЙНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ ДУХОЎНАЙ КУЛЬТУРЫ Ў ЭПОХУ СЯРЭДНЯВЕЧЧА

Важнае месца ў метадалогіі сучаснай тэорыі культуры займае цывілізацыйны падыход — спосаб тлумачэння культурна-гістарычных працэсаў на аснове аналізу структуры, да якой належыць дадзеная культура. Заснавальнікі цывілізацыйнага падыходу Мікалай Якаўлевіч Данілеўскі, Освальд Шпенглер, Арнольд Джазеф Тойнбі раблі ўпор на аналізе своеасаблівасцей так званых лакальных цывілізацый, або культурна-гістарычных тыпаў, якія, на іх думку, развіваюцца зусім ізалявана і падобна жывым арганізмам праходзяць пэўныя фазы жыццядзейнасці, а затым старэюць і паміраюць. Такі класічны варыянт цывілізацыйнага падыходу выкарыстоўваецца практычна без істотных змен многімі сучаснымі тэарэтыкамі і гісторыкамі культуры. Аднак ён мае шэраг недахопаў, адзін з якіх — недаацэнка важнейшай ролі цывілізацыйных асаблівасцей нацый і народаў, гэта значыць недаацэнка этнакультурнага ўзроўню ў цывілізацыйных даследаваннях. Менавіта народ, этнас, уваходзячы ў тую ці іншую лакальную цывілізацыю, уяўляе сабой і асобую, адносна самастойную цывілізацыйную цэласнасць, што выступае як суб’ект стварэння духоўнай культуры. У гэтым сэнсе этнакультура адначасова ўваходзіць у лакальную цывілізацыю ў якасці аднаго з яе структураўтваральных элементаў і як бы выпадае з яе, утвараючы самастойную цэласнасць і першаэлемент міжкультурных узаемадзеянняў.

На гэтай метадалагічнай аснове прасочым некаторыя цывілізацыйныя асаблівасці развіцця беларускай культуры.

Гісторыя духоўнай культуры беларускага народа паказвае, што яе фарміраванне і развіццё адбываліся на стыку цывілізацыйных узаемадзеянняў Захаду і Усходу, Еўропы і Азіі. Геаграфічна Беларусь размешчана на мяжы заходняга “разлому” ўсходнеславянскай цывілізацыі, што абумовіла пастаяннае хістанне геакультурных узаемадзеянняў на цывілізацыйныя асаблівасці беларусаў з боку заходняй і ўсходнеславянскай цывілізацый. Успомнім, што тэорыя разломаў паміж цывілізацыямі належыць вучонаму з ЗША Элсуфту Хантынгтону, які правёў аналогію геакультурных меж паміж цывілізацыямі з геалагічнымі разломамі зямной кары, недалёка ад якіх, што ўсім вядома, назіраюцца катастрафічныя працэсы, перш за ўсё гэта землятрусы і вулканічныя вывяржэнні. Такія ж працэсы, небяспечныя сутыкненнямі цывілізацый і катастрофамі нацыянальных культур, назіраюцца, як лічыць Хантынгтон, на геакультурных разломах паміж лакальнымі цывілізацыямі.

Сапраўды, фарміраванне беларускай этнакультуры пачынаецца ў перыяд Вялікага перасялення народаў на пераломе эпох. Яно завяршылася, як вядома, крушэннем земнаморскіх цывілізацый старажытнасці, аб’яднаных Рымскай імперыяй, і рассяленнем варварскіх германскіх і славянскіх плямён па ўсёй Еўропе. Старажытныя крывічы, палачане, дрыгавічы і іншыя плямёны, што склалі аснову беларускай народнасці, былі тыповымі еўрапейскімі варварскімі плямёнамі, цывілізацыйныя асаблівасці якіх складваліся пасля канчатковага рассялення з улікам аселай гаспадарчай дзейнасці. Беларускія землі аказаліся на перасячэнні культурна-камунікацыйных патокаў на заходнім участку буйнейшага транспартна-гаспадарчага шляху сярэдневяковай Еўропы — “з варагаў у грэкі”. У выніку ўжо з пачатку зараджэння беларуская духоўная культура мела інтэркультурны, сінтэтычны характар.

Зараджэнне дзяржаўнасці ў межах Полацкага, Турава-Пінскага, Мінскага і іншых княстваў адбывалася ў рамках агульнай для рускіх, украінцаў і беларусаў сярэдневяковай Кіеўскай Русі. Ужо ў гэты перыяд Заходняя Русь мела пэўныя цывілізацыйныя адрозненні ад Паўночнай (Наўгародскай), Паўднёвай (Кіеўскай), Паўночна-Усходняй (Уладзімірскай і Маскоўскай) Русі, што выявілася ў шэрагу спусташальных ваенных сутыкненняў. Этнічнай перадумовай гэтых цывілізацыйных адрозненняў стала наяўнасць балтцкага субстрату, а геакультурнай перадумовай — пастаянныя і ўстойлівыя сувязі з заходнеславянскімі дзяржавамі — Польшчай і Чэхіяй.

Беларуская духоўная культура належыць да тыпу адкрытых. У гісторыі свайго развіцця яна прайшла асноўныя этапы, характэрныя для агульнаеўрапейскага культурнага развіцця: старажытны язычніцкі перыяд, сярэдневяковы, рэнесансны і г. д.

Становішча беларусаў на мяжы двух культурна-гістарычных тыпаў (заходняга і ўсходнеславянскага) абумовіла ўласцівы ім менталітэт і архетыпы культуры [2, с 21]. Першым звярнуў увагу на спалучэнне ўсходнеславянскіх і заходнееўрапейскіх элементаў у беларускай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

духоўнай культуры Францыск Скарына. Філасофскае асэнсаванне гэтай з'явы было зроблена ў пачатку XX ст. Ігнатам Канчэўскім, які адзначаў: “Беларусь з X стагоддзя і да гэтага часу фактычна з'яўляецца полем барацьбы напрамкаў заходняга і ўсходняга. Мяжа гэтых уплываў, падзяляючы славянства на дзве часткі, праходзіць праз Беларусь, Украіну і хаваецца ў балканскіх краях... Мы не сталі народам Усходу, але і не прынялі культуры Заходняй Еўропы” [цыт. па: 3, с. 9].

Для фарміравання цывілізацыйных асаблівасцей беларускай духоўнай культуры вялікае значэнне мела прыняцце хрысціянства, якое, у адрозненне ад прымусовага хрышчэння Кіеўскай Русі, праходзіла мірным, эвалюцыйным шляхам і расцягнулася амаль на два стагоддзі. У выніку ўзнік сінтэз хрысціянскай духоўнасці і язычніцкай мастацкай міфалогіі, што, на думку У.Конана, з'явілася адной з прычын росквіту фальклору і моцнага ўплыву на нацыянальны менталітэт, архетыпы якога ўвасобіліся ў беларускай літаратуры [2, с. 22].

Старажытная беларуская духоўная культура фарміравалася пад значным уплывам светапогляднай парадыгмы хрысціянства. Ядро яе склалі прынцыпы духоўна-маральнай самадастатковасці чалавека і ідэя дабрыні як перадумова існавання і кансалідацыі цывільнага грамадства. Творчая сіла гэтай духоўнай традыцыі, якая, на думку А.Майхровіча, пачынаецца з X ст., выразна праявілася ў дзейнасці выдатных прадстаўнікоў культурна-асветніцкага руху XII ст. Ефрасінні Полацкай і Кірыла Тураўскага [4, с. 53].

Яшчэ больш актыўна разнастайнасць лакальных цывілізацыйных уплываў на беларускую духоўную культуру выявілася ў перыяд росквіту Вялікага княства Літоўскага. Мы маем на ўвазе ўзмацненне заходнееўрапейскага ўплыву. Раманскі ўплыў у духоўнай культуры быў звязаны з распаўсюджаннем хрысціянства па заходнім ўзоры, што выявілася ўжо ў IX ст. у стварэнні беларускага тыпу шматрэлігійнасці як прызнанага грамадствам сацыяльнага інстытута. Праваслаўе, каталіцызм, пратэстантызм, іудаізм і іслам суіснавалі ў Беларусі без вайны і грамадзянскага процістаяння, уласцівых практычна ўсім краінам свету. Канкурэнцыя паміж імі праяўлялася ў дыспутах і дыскусіях на багаслоўскія тэмы, а не ў рэлігійных войнах і сутыкненнях. Такая цывілізацыйна-светапоглядная арыентацыя прадвызначыла апераджальнае развіццё інстытутаў сярэдневяковай дэмакратыі і прававой дзяржаўнасці.

Традыцыі дэмакратыі атрымалі развіццё ў народным веча ў часы “баярскай рэспублікі”, у дзейнасці сельскага копнага суда, ва ўласнай юрысдыкцыі шэрага беларускіх сярэдневяковых гарадоў, меўшых магдэбургскае права. Яны былі замацаваны ў кодэксах шляхецкай вольнасці, вышэйшай формай якіх з'явіўся Статут (1588). Такім чынам, беларуская палітычная і прававая культура не толькі развівалася ў рэчышчы заходнееўрапейскай дэмакратычнай традыцыі і засвойвала лепшыя яе ўзоры, але і апярэдзіла Заходнюю Еўропу ў сферы канстытуцыйнага права і шэрага інстытутаў прававой дзяржавы. Гэтыя дасягненні былі замацаваны ліквідацыяй інстытута халопства і падзелам улады ў дзяржаве на тры асноўныя формы — заканадаўчую, выканаўчую і судовую. У выніку адной з цывілізацыйных асноў стаў яе дэмакратызм.

Гуманістычная хрысціянская традыцыя ўмацоўвалася ў Беларусі на працягу многіх стагоддзяў, стаўшы адным з найбольш важных набыткаў нацыянальнай духоўнай культуры. Гэта ў сваю чаргу выклікала рацыяналізацыю духоўнага свету чалавека. Сваю вышэйшую форму гуманістычная хрысціянская традыцыя набыла ў асветніцкай дзейнаці Ф.Скарыны і ў дзейнасці рэлігійных рэфарматараў Сымона Буднага і Васіля Цяпінскага. На глебе хрысціянскага гуманізму і рацыяналізму праходзіў уздым беларускай культуры ў эпоху Рэнесансу і Рэфармацыі XVI—XVII стст., калі інтэнсіўна афармляюцца і развіваюцца розныя сферы нацыянальнай духоўнай творчасці — літаратура, мова, летапісанне, грамадска-патрыятычная самасвядомасць, калі ўзнікае і становіцца важным фактарам замацавання культурных каштоўнасцей беларускае кнігадрукаванне [4, с. 52—57].

Такім чынам, духоўная культура беларусаў, нягледзячы на вельмі цяжкія крушэнні, заваёвы, палітычныя, ваенныя і сацыяльныя катастрофы, крызісы эканомікі і культуры, асіміляцыйныя тэндэнцыі і іншае, ад эпохі сярэднявечча і да нашых дзён пастаянна развівалася і абнаўлялася. Яна ўвасобіла такія рысы, як сінтэтызм, дэмакратызм, верацярпімасць, схільнасць да грамадзянскага кампрамісу, гуманізм і рацыяналізм. Гэтыя цывілізацыйныя асновы духоўнай культуры не былі страчаны ў складанейшых гістарычных калізіях новай і навейшай гісторыі. Яны сталі часткай культурнай самасвядомасці і патрабуюць для свайго адраджэння і ўмацавання актыўнай асветніцкай дзейнасці беларускай культурнай эліты. Вяртанне і абнаўленне напрацаваных стагоддзямі цывілізацыйных асаблівасцей развіцця духоўнай культуры можна разглядаць і як

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

важнейшую лёсавызначальную праблему развіцця беларускай этнакультуры. Ад яе рашэння залежыць існаванне беларускай нацыі і дзяржавы.

Важнейшай цывілізацыйнай прыметай беларускай духоўнай культуры з'яўляецца і яе своеасаблівая дваістасць. Пастаянныя хістанні паміж прыналежнасцю да ўсходнеславянскай цывілізацыі і імкненнем да агульнаеўрапейскай духоўнай традыцыі ішлі ад эпохі да эпохі і выявіліся ў такіх цывілізацыйных асаблівасцях беларускай духоўнай культуры, як спалучэнне шматрэлігійнасці з прыхільнасцю большасці насельніцтва да праваслаўнага тыпу рэлігійнай духоўнасці, сінтэз агульнаеўрапейскіх і ўсходнеславянскіх традыцый у музыцы, тэатральным мастацтве, выяўленчым мастацтве і інш.

Паказаныя вышэй цывілізацыйныя асаблівасці беларускай духоўнай культуры на сучасным этапе яе развіцця патрабуюць далейшых спецыяльных навуковых даследаванняў.


1. *Галаўнёў А.І.* Інтэграцыя Беларусі ў еўрапейскае і сусветнае супольніцтва і праблема самабытнасці беларускага народа // Гуманітарныя і сацыяльныя навукі на зыходзе XX стагоддзя: Зб. / Аддзел навук. інф. па гуманітар. навуках НАН Беларусі. — Мн., 1998. — С. 69—71.

2. *Конан У.* Архетыпы беларускага менталітэту: спроба рэканструкцыі паводле нацыянальнай міфалогіі і казачнага эпасу // Беларусіка=Albaruthenika. — Мн.: Навука і тэхніка, 1993. — Кн. 2. — С. 16—24.

3. *Абдзіраловіч І.* Адвечным шляхам. Дасьледзіны беларускага сьветапогляду. — Вільня: Беларускае выдавецкае мастацтва, 1921. — 71 с.

4. *Майхровіч А.С.* Нацыянальныя духоўныя традыцыі і беларуская ідэя // Гуманітарныя і сацыяльныя навукі на зыходзе XX стагоддзя: Зб. / Аддзел навук. інф. па гуманітар. навуках НАН Беларусі. — Мн., 1998. — С. 52—57.

5. *Рагуля А.У.* Беларуская культура ў еўрапейскім кантэксце // Грамада- знаўчыя навукі: метадалогія, праблемы, перспектывы: Штогоднік навук. да- след. кафедры грамадазн. навук БДПУ. — Мн., 2001. — Вып. 1. — С. 153—155.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ